# ПАЭМА А. КУЛЯШОВА “ВАРШАЎСКІ ШЛЯХ”: ІДЭЙНА-СТЫЛЯВЫ ЗМЕСТ І ЖАНРАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

**Ю. А. Казак**
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** Вызначаецца філасоскі змест паэмы А. Куляшова “Варшаўскі шлях”. Прапануецца даследчыцкая інтэрпрэтацыя вобразаў шляху, паэта, хваробы і інш. Звяртаецца ўвага на жанравую прыроду твора.

**Ключавыя словы:** А. Куляшоў; паэма-споведзь; паэма-мналог; лірыка-філасофская паэма.

Творчасць Аркадзя Куляшова пазначана цікавасцю да жанру лірыка-філасофскай паэмы. Пісьменнік неаднойчы звяртаўся да паэмы-споведзі з характэрнай для яе маналагічнай формай выяўлення поглядаў на розныя праблемы рэчаіснасці. Адзін з такіх твораў – паэма “Варшаўскі шлях” (1972), прысвечаная А. Твардоўскаму, якога не стала ў 1971 г.

А. Твардоўскі быў для А. Куляшова не толькі таварышам па пяру, але і земляком, настаўнікам і нават кумірам. Прызнаны майстра, аўтар славутых твораў пра салдата Васіля Цёркіна высока ацаніў напісаную на ваенным матэрыяле паэму “Сцяг брыгады”, чым у многім вызначыў напрамак далейшага літаратурнага развіцця А. Куляшова. Таму, страціўшы ў асобе Твардоўскага добрага сябра і дарадцу, беларускі мастак адчуў боль, быў вымушаны падвесці вынік узаемастасункам, вызначыць ролю рускага пісьменніка ў сваім жыцці, ацаніць выключную значнасць яго асобы і дзейнасці для літаратуры: “*Ніхто таго не дагаворыць хорам, / Што ён адзін дагаварыць бы мог…* ”, “*На ўсіх франтах, мой шлях, ён вёў баі*”, “*салдатам нёс уцеху*”, “*Не толькі мне, не дадзена Гамеру / Сказаць аб тым, што адляцела з ім*” [2].

Вобраз хваробы, якая адабрала жыццё А. Твардоўскага, у паэме персаніфікуецца: “*Страшней, калі забойца, што ў пасцелі, / Выходзіць не жадае на дуэль, / Ад лекараў хаваючы свой вырыс*” [2]. Перажываючы заўчасную смерць свайго аднадумцы і таварыша, А. Куляшоў трансфармаваў свой боль у вершаваныя радкі, выбраўшы адрасатам Варшаўскі шлях. Варшаўская шаша, злучаючы Смаленшчыну, радзіму Твардоўскага, і родныя магілёўскія мясціны А. Куляшова, адыгрывала ролю “*сяброўства сувязнога*”. Пры гэтым аўтар прыходзіць да філасофскай высновы, што шлях не проста звязвае пэўныя пункты, але і з’яўляецца “*вечным і нязменным сувязным душ*”, здольным лячыць, суцяшаць і даваць надзею, і што менавіта яму належыць вырашальная роля ў лёсах людзей.

А. Куляшоў на глебе разваг пра сябе і Твардоўскага ўздымае пытанне пра лёс паэта ўвогуле: выказвае ідэю аб тым, што прычынай заўчаснай гібелі творцаў з’яўляецца не хвароба, пятля ці вайна, а менавіта паэзія: “*Не веру я, што Пушкіна Дантэс / Што Лермантава некалі Мартынаў / Забіў. Не веру! Волатаў скасіла / Паэзія, а ворагі пасля, / Ясеніна – яна, а не пятля*” [2]. Магчыма, А. Куляшоў меў на ўвазе не саму творчасць, а менавіта асаблівасці тонкай паэтычнай натуры. Захапленне паэзіяй – гэта толькі следства, праявы індывідуальных схільнасцей, жыццёвая неабходнасць чулай душы.

Узгадваючы імёны Пушкіна, Лермантава, Ясеніна – тых, чыё жыццё было выпрабаваннем на ўдачу, Куляшоў сцвярджае: хвароба таварыша – таксама вынік падзей, якія прыйшлося пералсыць паэту (“*Адкуль узяўся смертаносны вірус, / Прыстасаваўся да якіх умоў? / А можа, ён з вайны той самай вырас*”), а таксама яго неабыякавасці, самаахвярнасці (“*Ратуй людзей з бяды ліхой, іх душы / На гвалт і на адчай не пакідай, / Ты радасць ім нясі, сабе – адчай, / Ім – волю, гвалт – сабе, ты духам дужы*” [2]). Таму і літаратурную дзейнасць А. Твардоўскага падчас Вялікай Айчыннай вайны А. Куляшоў называе подзвігам: “*На позвіг, а не танныя заробкі / Ішоў зямляк наш, кнігі кладучы, / На шалі часу, нібы самародкі, / З пластоў глыбокіх вымытыя працай...*” [2].

Прасякнуты пачуццём горычы і віны “Варшаўскі шлях”, як і іншая куляшоўская паэма “Маналог”, – гэта даніна памяці сяброўству, рэквіем па таварышах: “*...яны не вінаваты, як ты і я, мой шлях... А ўсё ж на сэрцы блага мне*”, “*...няма спакою ад здзіўлення, / Што я ў гасцях яшчэ, што дома ён*” [2]. І калі ў “Маналогу” пачуццё віны было выклікана асэнсаваннем недарэчнасці заўчаснай гібелі маладых талентаў З. Астапенкі і Ю. Таўбіна, то ў “Варшаўскім шляху” прырода віны іншая. Магчыма, Куляшоў пашкадаваў, што не падтрымаў таварыша, калі таго бэсцілі як рэдактара прагрэсіўнага часопіса “Новый мир”, не выйшаў са складу рэдкалегіі, як гэта зрабілі некаторыя іншыя літаратары ў салідарнасць з апальным паэтам [Гл.: 1, с. 451–452].

У фінале паэма-споведзь ператвараецца ў малітву, напоўненую надзеяй на захаванне памяці пра сябра і яго подзвіг: “*Няхай, як памяць вечная аб ім / Твая, як да цябе мая малітва, / Ідзе ў гару, далоні склаўшы, дым*” [2]. У частцы “Замест эпілогу” гучыць малітва не толькі за Твардоўскага, але і за самога аўтара і яго набыткі ў рэчышчы паэзіі. Некаторыя радкі гэтай малітвы пазначаны ваяўніча-змагарскім, публіцыстычным пафасам: “*Ты не дазволь, каб за маёй спіною / Зло з крыкамі зларадны́мі ішло. / Дазволь, каб верш мой мінай быў тваёю / Там, дзе крывёю захлынецца зло*” [2].

Вобраз чалавека, які павінен ушаноўваць мінулае і быць адказным за сучаснасць, за людзей, якія побач з ім (прычым побач не ў прасторы, а ў часе), а таксама за ўсю Зямлю, паўстае ў многіх філасофскіх творах А. Куляшова. Не стала выключэннем і паэма “Варшаўскі шлях”. Тут такая адказнасць

успрымаецца не толькі як доўг пісьменніка, але і як абавязак кожнага чалавека: “*З сям’ёю продкаў не жыві ў разладзе, /... Яны мінулы час у новым часе. / ... Ты, як нашчадак іх, за ўсё ў адказе / ... Ты сам гарыш, калі Зямля гарыць!..*” [2]. У “Варшаўскім шляху” аўтар не абмяжоўваецца часавымі або прасторавымі рамкамі, бо закладзеныя ў творах ідэі не страчваюць сваёй актуальнасці ў розныя эпохі, маюць вялікі ідэйна-сэнсавы патэнцыял і шырокія магчымасці для інтэрпрэтацыі.

**Літаратура**


1. Арочка, М. М. Аркадзь Куляшоў / М. М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. – Мінск, 2001–2015. – Т. 3 : 1941–1965. – 2-е выд. – 2002. – С. 416–456.
2. Куляшоў, А. Варшаўскі шлях [Электронны рэсурс] / А. Куляшоў / Беларуская палічка. – Рэжым доступу: http:/knihi.com/Arkadz_Kulasou/Varsauskki_slach.html. – Дата доступу: 28.02.2020.